**Міністру ўнутраных спраў**
**Куляшову А.Н.**

**Паважаны Анатоль Нілавіч!**

ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" звяртаецца да Вас у сувязі з грубымі перашкодамі прафесійнай журналісцкай дзейнасці, якія адбыліся 16 і 9 верасня ў Мінску.

Увечары 16 верасня на Кастрычніцкай плошчы супрацоўнікі праваахоўных органаў з ужываннем фізічнай сілы забаранялі журналістам беларускіх і замежных СМІ фіксаваць падзеі падчас акцыі памяці зніклых 10 гадоў таму палітыка Віктара Ганчара і бізнесоўца Анатоля Красоўскага. Людзі ў цывільным, якіх даводзілася па 2 чалавекі на кожнага журналіста, груба і небяспечна для тэхнікі і рэпарцёраў захіналі відэа- і фотакамеры, адштурхоўвалі рэпарцёраў ад аб'ектаў падзей, нягледзячы на наяўнасць у журналістаў рэдакцыйных пасведчанняў. Амаль тое самае адбывалася і 9 верасня, калі супрацоўнікі міліцыі перашкаджалі журналістам асвятляць пікет на Кастрычніцкай плошчы, азначаны лозунгамі пратэсту ўводу расійскіх войск-удзельнікаў вайсковых манеўраў "Захад-2009" на тэрыторыю Беларусі.

Выказваем сур'ёзную заклапочанасць тым, што падобныя факты падчас масавых акцый ізноў становяцца сістэматычнымі і сведчаць пра адмысловыя загады, пры выкананні якіх супрацоўнікі сілавых структур парушаюць патрабаванні заканадаўства.

Дасылаем Вам фотаздымкі асобаў, якія груба перашкаджалі журналісцкай дзейнасці 16 верасня.

Заклікаем:

– высветліць, хто аддаваў і выконваў загады на стварэнні перашкодаў прафесійнай дзейнасці журналістаў, і прыцягнуць вінаватых да адказнасці;

– яшчэ раз давесці да службовых асобаў і іншых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, што журналісты падчас масавых акцый, як і супрацоўнікі міліцыі, выконваюць свае прафесійныя абавязкі;

– забяспечыць тлумачэнне супрацоўнікам органаў унутраных спраў заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі, згодна з якім журналіст мае права «прысутнічаць у раёнах узброеных канфліктаў альбо надзвычайных сітуацый, на масавых мерапрыемствах, у месцах іншых грамадска важных падзей і перадаваць адтуль інфармацыю» (п.2.2. арт. 34 дзейнага закона «Аб СМІ»);

– прыняць іншыя меры для прафілактыкі парушэнняў правіл работы з прэсай.

Просім Вас паведаміць аб выніках разгляду гэтага звароту.

З павагай,
па даручэнні Праўлення ГА “БАЖ”
намеснік старшыні Андрэй Бастунец

Дадатак:

1. Фотаздымкі асобаў, якія перашкаджалі прафесійнай дзейнасці журналістаў 16.09.2009 г. (14 фотаздымкаў).